# Новы подых

## атрымала на сваім з'ездзе Беларускае педагагічнае таварыства

**12 мая ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі адбыўся з'езд Беларускага педагагічнага таварыства. У рабоце з'езда прынялі ўдзел міністр адукацыі Сяргей Аляксандравіч Маскевіч, яго намеснікі, кіраўніцтва АПА, прадстаўнікі НІА, вядучых ВНУ краіны, кіраўнікі ўстаноў адукацыі рознага ўзроўню, педагогі.**

Вітаючы ўдзельнікаў з'езда, міністр адукацыі С.А.Маскевіч узгадаў гісторыю стварэння грамадскіх педагагічных фарміраванняў на Беларусі. Першыя таварыствы пачалі стварацца ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. У 1972 годзе па рашэнні Савета Міністраў Беларускай ССР было створана рэспубліканскае педагагічнае таварыства. Пасля распаду Савецкага Саюза Беларускае педагагічнае таварыства атрымала статус самастойнага грамадскага аб'яднання педагогаў рэспублікі, у склад якога ўваходзіла каля 30 тысяч работнікаў асветы і навукі. Прыярытэтным кірункам дзейнасці таварыства стала вырашэнне праблем грамадзянска-патрыятычнага выхавання настаўніцтва і навучэнцаў.

Як падкрэсліў Сяргей Аляксандравіч Маскевіч, для Міністэрства адукацыі стала практыкай абапірацца ў сваёй рабоце на грамадскае меркаванне, арганізоўваць педагагічную экспертызу, улічваць пункт погляду настаўнікаў-практыкаў. "Важна, каб мы асвоілі навуку ўзаемаўзбагачэння, абмену вопытам, дасягненнямі і напрацоўкамі, разам шукалі і знаходзілі вырашэнне праблем, — падкрэсліў міністр адукацыі. — У межах правільна наладжанай дзейнасці грамадскай арганізацыі гэта становіцца рэальным".

Сёння сістэма адукацыі добра арганізавана, ёсць дакладна пабудаваная структура кіравання, паспяхова функцыянуюць у сістэме адукацыі грамадскія аб'яднанні, у іх ліку — галіновы прафсаюз, маладзёжная арганізацыя БРСМ. Ці не будзе педагагічнае таварыства дадатковай нагрузкай для сістэмы ўвогуле і кожнай установы адукацыі ў прыватнасці? "Разважаючы на гэтую тэму, я прыйшоў да высновы, — падзяліўся С.А.Маскевіч, — што нам трэба сабрацца і пагаварыць пра гэта, пастарацца пачуць адно аднаго. Я думаю, што сёння вельмі важна, каб мы надалі не толькі новы подых педагагічнаму таварыству, але і сфарміравалі такія формы карпаратыўнага ўзаемадзеяння, якія будуць адэкватныя часу. Гэта павінна быць таварыства людзей, якія неабыякава ставяцца да сваёй прафесіі, якія ведаюць, што рабіць, і гатовы падзяліцца сваім вопытам. Як паказала грамадскае апытанне, педагогі краіны ў поўнай меры асэнсоўваюць неабходнасць аб'яднання ў актыўна дзеючую грамадскую арганізацыю, якая б садзейнічала згуртаванню настаўнікаў, выкладчыкаў, выхавальнікаў, кіраўнікоў адукацыі ў вырашэнні задач выхавання і навучання моладзі.

►►► 2 стар.

# Новы подых

## атрымала на сваім з'ездзе Беларускае педагагічнае таварыства

◄◄◄ 1 стар.

«Асноўнымі задачамі педагагічнага таварыства павінны стаць развіццё творчай ініцыятывы педагагічных работнікаў, павышэнне прэстыжу настаўніцкай прафесіі, распаўсюджанне эфектыўнага перадавога вопыту, умацаванне сувязі педагагічнай навукі і практыкі, арганізацыя прафесійных зносін".

Па прызнанні Леаніда Міканоравіча Ціханава, старшыні Беларускага педагагічнага таварыства, па-рознаму ў справаздачны перыяд жыло педагагічнае таварыства. "Пры ўсіх мізэрных рэзервах мы ўсё-такі праводзілі мерапрыемствы, працавалі на рэалізацыю ідэй патрыятызму. Мы заўсёды гучна заяўлялі, што патрыятызм — гэта стрыжань нашай моладзі, грамадства. Наступнае пакаленне членаў педагагічнага таварыства і яго кіраўніцтва будзе выпрацоўваць сваю лінію, тактыку, стратэгію, і я перакананы, што іх дзейнасць будзе больш паспяховай, чым на папярэдніх этапах функцыянавання педагагічнага таварыства. Але, тым не менш, нам бы хацелася пажадаць, каб новы склад педагагічнага таварыства і яго кіраўніцтва з глыбокай павагай адносіліся да выдатных традыцый таварыства", — заўважыў Л.М.Ціханаў.

"Спытайце любога творчага, крэатыўнага настаўніка, чаго больш за ўсё яму не хапае для работы, — заўважыла Ірына Рамуальдаўна Клявец, настаўніца біялогіі гімназіі № 4 Смаргоні, пераможца конкурсу "Настаўнік года-2006", старшыня клуба "Крыштальны журавель". — Практычна кожны адкажа, што не хапае педагагічных зносін з такімі ж крэатыўнымі і творчымі педагогамі, як і ён. Не хапае магчымасці падзяліцца сваімі напрацоўкамі, сваімі педагагічнымі ідэямі з аднадумцамі. Педагагічнае таварыства таксама неабходна для падняцця прэстыжу педагагічнай прафесіі. За павышэнне прэстыжу прафесіі трэба змагацца не словамі, а добрасумленна выконваючы сваю работу. Клубу "Крыштальны журавель" — пяць гадоў. За гэты час яго прызналі педагогі краіны, нас з задавальненнем прымаюць у сваіх школах. Нам ёсць чым ганарыцца. Знойдзена, апрабавана і эфектыўна працуе новая форма метадычнай работы настаўнікаў, дзе роўны вучыць роўнага".

Па меркаванні Ірыны Рамуальдаўны, каб педагагічнае грамадства паспяхова і актыўна існавала, неабходна некалькі ўмоў. Найперш гэта ініцыятыва саміх педагогаў. Клуб існуе таму, што педагогі бескарысліва працуюць дзеля таго, каб самарэалізавацца, атрымаць жыццёвыя сілы і энергію ў зносінах з калегамі, аднадумцамі. Другая ўмова — падтрымка. Клуб існуе дзякуючы падтрымцы АПА, Міністэрства адукацыі, прафесійнага саюза работнікаў адукацыі. Трэцяя важная ўмова — вызначэнне кірункаў дзейнасці. У клубе настаўнікі робяць тое, што яны выдатна ўмеюць рабіць, яны добра валодаюць методыкай правядзення ўрокаў, таму сваім майстэрствам з калегамі дзеляцца праз адкрытыя ўрокі.

"Вельмі хочацца пажадаць, каб педагагічнае таварыства мела гэтыя тры ўмовы для актыўнага паспяховага існавання, — сказала Ірына Рамуальдаўна Клявец. — Беларускае педагагічнае таварыства — гэта патрэбная справа, але важна, каб яна не ператварылася ў фармальную арганізацыю, а дзейнічала актыўна, рэальна дапамагаючы кожнаму педагогу, які захоча стаць яго членам, узнімаць свой прафесійны ўзровень і вырашаць многія праблемы нашай адукацыі".

Пасля пленарнага пасяджэння з'езд прадоўжыў работу па 12 секцыях. Як расказаў рэктар АПА А.П.Манастырны, па выніках падрыхтоўчай работы, якая была праведзена работнікамі АПА і іншымі структурамі, быў падрыхтаваны шэраг важных дакументаў па рабоце БПТ, і гэта ўсе ўдзельнікі з'езда павінны абмеркаваць у сваіх секцыях. Згодна са статутам таварыства, удзельнікі з'езда выбіраюць савет, які затым выбірае прэзідыум і старшыню савета. Старшынёй савета Беларускага педагагічнага таварыства была выбрана Галіна Іванаўна Нікалаенка, прарэктар па навукова-метадычнай рабоце АПА.

На першым этапе, на думку міністра адукацыі С.А.Маскевіча, трэба аказаць арганізацыйную і фінансавую падтрымку таварыству. Гэта могуць зрабіць работнікі сістэмы дадатковай адукацыі дарослых, у рэгіёнах, у прыватнасці, работнікі метадычных кабінетаў. "Трэба запусціць у работу гэтае сеткавае ўзаемадзеянне з дапамогай інтэрнэту, — заўважыў міністр адукацыі. — Важна інтэрнэт-прастору запоўніць расказамі пра справы нашых выдатных педагогаў, моладзі. Як мы гэта зрабілі на сваім партале Міністэрства адукацыі (рубрыка "Адукацыя ў асобах"). Педагагічнае таварыства павінна быць самаарганізаванай структурай, у межах якой павінна быць створана такое асяроддзе, якое б стымулявала педагогаў да павышэння прафесіяналізму, а значыць, якасці адукацыі ў цэлым і павышэння прэстыжу прафесіі".

**Святлана КІРСАНАВА.**
*kirsanava@ng-press.by*